# Намаганне ўспомніць

## У мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" працуе выстава жывапісу Івана Семілетава "Зменлівасць адлюстравання"

Чалавек і час... Ці гэта час праходзіць праз чалавека, пакідаючы яму ад яго ж мінулага толькі цьмяныя і ледзь улоўныя ўспаміны? Ці гэта чалавек праходзіць праз час, зазіраючы ў будучыню і гледзячы на сябе ў будучыні, але такога ж цьмянага і ледзь улоўнага? Або яны ідуць разам? Ідуць дзень, месяц, год, дзесяцігоддзе... Але раптам спыняюцца і з выклікам глядзяць адно аднаму ў вочы. Хто першым адвядзе вочы? Хто не стрывае погляду? Смяротны ці вечны?


"Паміжчасм", 2014.

Чалавек і час... Чалавек памірае, і час для яго спыняецца. А ці можа быць наадварот? Ці можа памерці час, пакуль чалавек жывы? І калі можа, то ці спыніцца тады чалавек?

Чалавек і час... Чалавек у часе і па-за часам. Чалавек, які азіраецца назад і пытаецца: "А калі гэта было?" Здзіўляецца: "Хіба гэта я?" Сумняваецца ці спадзяецца: "Можа быць, усё-такі гэта не я?" Хоча ўспомніць: "Што гэта было, як было?"

Намаганне ўспомніць — гэта яшчэ не сам успамін. Балюча або прыемна будзе пазней, калі ўрэшце ўспомніш.

Выстава Івана Семілетава "Зменлівасць адлюстравання" правакуе гледача на небяспечныя пытанні, апелюючы да метафізікі адчуванняў. Мы таксама задалі некалькі пытанняў мастаку, які "спрабуе зрабіць сумленны і складаны ўчынак — саступіць сваё месца аўтара часу і ўспамінам" (з анатацыі да выставы).

***— Іван, серыя вашых новых карцін пад агульнай назвай "Зменлівасць адлюстравання", дзе вы спрабуеце саступіць сваё месца аўтара часу і ўспамінам, выразна адрозніваецца ад усіх астатніх прадстаўленых у экспазіцыі работ. Гэта дамінанта толькі гэтай выставы ці ўвогуле вашай творчай манеры і, нават больш, вашага сённяшняга светаўспрымання?***

— Серыю "Зменлівасць адлюстравання", якая аб'ядноўвалася б адным колерам і адной пластычнай ідэяй, я задумаў напісаць яшчэ ў 2009 годзе. Сёння можна ўбачыць плён маіх пошукаў апошніх гадоў. Але я ўсё-такі не казаў бы, што гэта нейкая знойдзеная раз і назаўсёды дамінанта, — іншымі словамі, мой пазнавальны сённяшні стыль. Я ўвогуле шмат эксперыментую, раблю многа яркіх, каляровых работ, часта непрад-


"Серанада", 2011.

прыклад, такія серыі, як "Кветкі", назва якой гаворыць сама за сябе, "Персанажы", дзе галоўная ўвага ўдзяляецца чалавечай фігуры і твару, бясконцым варыянтам іх трактоўкі... Гэтую задачу — вынаходзіць новыя варыянты трактоўкі чалавечага твара — я і стаўлю перад сабой як перад мастаком.

***— Патлумачце, калі ласка, што гэта значыць — вынаходзіць новыя варыянты трактоўкі чалавечага твара.***


Аўтар побач з карцінай "Танец", 2014.

### Даведка

*Іван Семілетаў нарадзіўся ў 1980 годзе ў Мінску. Вучыўся ў 75-й мінскай гімназіі, Гімназіі-каледжы мастацтваў імя І.В.Ахрэмчыка. У 2004 годзе скончыў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў. З 2007 года займаецца выставачнай дзейнасцю. У перыяд з 1999 па 2005 год афармляў кнігі для выдавецтваў "Мастацкая літаратура", "Беларуская навука", "Белфакс". З 2007 года — сябар Міжнароднага аб'яднання мастакоў "Сонечны квадрат", з 2008 года — сябар Беларускага саюза мастакоў. Працуе ў манументальным і станковым жывапісе, графіцы, габелене. Работы знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, Рускім музеі ў Санкт-Пецярбургу, Музеі сучаснага мастацтва ў Нью-Ёрку, прыватных калекцыях ЗША, Партугаліі, Германіі, Аўстрыі, Італіі, Сірыі і іншых краін.*


"Кветкі", 2012.

— Я называю гэта кіруемай выпадковасцю. Гэта, калі, напрыклад, ты рвеш на дробныя кавалачкі паперу, а потым з мно-


"Персанаж-20", 2014.

ства гэтых выпадковых элементаў спрабуеш упарадкаваць нешта, што падасца табе цэльным і завершаным. Іншымі словамі, гэта рух ад хаосу, ад выпадковасці да цэласнасці. Ты прыбіраеш лішняе, прыбіраеш, прыбіраеш — і так да таго моманту, пакуль не застанецца галоўнае і новае, нечаканае для цябе самога. І, калі вы звярнулі ўвагу, многія твары і фігуры ў маіх работах менавіта такія — цэльныя і самадастатковыя, ад іх ужо нельга нічога адарваць і нельга нічога да іх дадаць. Яны ўжо жывуць у творы самі па сабе. Тут у чым сэнс? Разумееце, вельмі часта многія мастакі працуюць у адной стылявой сістэме. Гэта, магчыма, і нядрэнна, бо ў такім разе яны становяцца пазнавальнымі для гледача. Але гэтая стылявая сістэма для іх як клетка, у якой яны мусяць сядзець заўсёды. Калі яны выберуцца з яе, то згубяць свой стыль. Калі застануцца, не будзе ніякага развіцця, а будзе

мі важная рызыка ў творчасці — калі ты не ведаеш, што ў цябе атрымаецца, але ты ўсё адно робіш гэта і ўрэшце прыходзіш да нейкага важнага для цябе выніку.

***— Даруйце, а вам камфортна з вашай кіруемай выпадковасцю працаваць у тутэйшым мастацкім асяроддзі, пакуль яшчэ ўсё-такі дастаткова кансерватыўным у параўнанні з сітуацыяй на Захадзе?***

— Вы ведаеце, я думаю, асяроддзе не іграе асаблівай ролі. Бо мастак... Ён павінен зрабіць сябе сам. Не важна дзе: у Беларусі, у Маскве ці яшчэ дзе-небудзь. Трэба стварыць свой свет. І трэба зрабіць гэта сваімі рукамі. І калі не наракаць на тое, што табе нешта перашкаджае (а нешта будзе заўсёды перашкаджаць!), то ў прынцыпе і ў Беларусі можна стаць паспяховым мастаком.

***— Але для вас значыць што-небудзь паняцце нацыянальнага ў мастацтве або не?***


"Парад планет", 2014.

— Асабіста я не стаўлю задачу зрабіць менавіта беларускі жывапіс. Аднак жа, калі прыязджаю, напрыклад, у Маскву і там паказваю свае карціны, мне чамусьці заўсёды гавораць, што ў мяне беларускі жывапіс. Яны так лічаць, напэўна, па нейкіх колеравых момантах, па нейкай энергетыцы, я нават не ведаю, па чым. Але нейкія няўлоўныя эмоцыі і адчуванні, якія перажывае чалавек тут, у нас, у Мінску, усё адно не знікаюць у нікуды, а застаюцца ў палотнах. Менавіта адчуванні, а не элементы нацыянальнай арнаменталістыкі, нацыянальнай каларыстыкі і г.д.

***— Якая самая знакавая для вас работа на гэтай выставе?***

— Гэта работа, найбольш сугучная мне сёння. Яна называецца "Паміж часам", з серыі "Зменлівасць адлюстравання". Там, мне здаецца, вельмі выразна сфармулявана галоўная ідэя: вось ёсць адзін час, а вось ёсць іншы час; а паміж імі існуе мяжа, разрэз, як быццам пілой распілавалі калісьці непадзельны час; і гэты разрэз праходзіць па салдаце, таму што звычайна менавіта войны дзеляць час на адзін і іншы...

***— Яшчэ некалькі пытанняў, спецыфічных для нашай "Настаўніцкай газеты". Калі цяпер да вас як ужо да сфарміраванага мастака прыходзяць на выставы вашы былыя выкладчыкі і настаўнікі, яны разумеюць вас як творцу?***

— Так, разумеюць. Напрыклад, у мяне вельмі прыемныя адносіны з маім колішнім выкладчыкам жывапісу ў акадэміі Іванам Дзямідавічам Кліменкам, таму што пра ўсё, што я раблю сёння, мы гаварылі яшчэ тады, калі я вучыўся ў акадэміі. Мы з ім абмяркоўвалі ўсе гэтыя пытанні кампазіцыі, колеру і г.д. Дарэчы, я вельмі часта ўзгадваю тыя нашы гаворкі, успамінаю яго жывапіс, сачу за тым, што ён робіць.

***— А ўвогуле, на вашу думку, у сучасным мастацтве яшчэ мае сэнс тэма настаўніка і вучня?***

— Яна будзе мець сэнс заўсёды, але толькі ў тым выпадку, калі настаўнік не робіць з вучня копію, а дапамагае яму развіцца самастойна, адчувае яго як асобу і ў патрэбным месцы гаворыць яму нешта. Прычым гэтае "нешта" з'яўляецца не проста парадай, маўляў, вазьмі вось тут і перапішы, зрабі так і так. Гэтае "нешта" азначае "зрабі свой выбар".

***— Акурат такім настаўнікам і быў у акадэміі Іван Кліменка?***

— Так. Ён ніколі нічога мне не навязваў, як і мой бацька, таксама мастак. Яны проста адчувалі, што мне ў той ці іншы час было бліжэй, і раілі так, каб я сам рабіў выбар.

***— Вы адчуваеце сябе сынам свайго бацькі не толькі па крыві, але і па творчасці?***



РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ